Са святам, дарагія жанчыны!

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА
УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 2 (242) 5 сакавіка 1997 года, серада



### ЖАНЧЫНЕ

*Няма тых слоў*
*У слоўніку яшчэ,*
*Што выкажуць усю любоў*
*Табе.*
*Складаць заўсёды трэба*
*Іх наноў,*
*Каб выказаць сваю любоў.*
*З усіх зямных*
*І боскіх таямніц*
*Няма яшчэ заманлівей і дзіўней.*
*Такой*
*Яна застацца*
*Назаўжды павінна.*
*Бо больш няма заманлівей і дзіўней.*
*Хай смутак, боль*
*Навек мінуць цябе,*
*А толькі ўсмешка ў вуснах тваіх спее.*
*Усіх*
*Яна цяплом сваім сагрэе,*
*Хай смутак, боль*
*Навек мінуць цябе.*

**"Наднёманскія галасы".**

### ЦИТАТА НОМЕРА:
**"Слова твои да будут немноги".**
**Экклезиаст.**

**Нашы метадысты**

## ПЕРШЫ ПАМОЧНІК



Метадыст на факультэце - важнае звяно арганізацыі навучальнага працэсу. Метадыст на факультэце - першы памочнік дэкана. А для студэнтаў добры метадыст - гэта ўсё: і старэйшы таварыш, і выхавацель, і дарадчык. Вядома, не кожнаму ўдаецца спалучаць дзелавыя якасці з чалавечнасцю, добразычлівасцю. У Крысціны Зыгмундаўны Варэйка гэта атрымалася.

На факультэце права і эканомікі яна працуе з 1978 года. За гэты час сваю работу асвоіла дасканала. Яна заўсёды ведае, дзе што адбываецца, дзе хто знаходзіцца. Работа метадыста факультэта не абмяжоўваецца толькі тэхнічным бокам, напрыклад, падрыхтоўкай раскладу заняткаў ці напісаннем аб'яў. Крысціне Зыгмундаўне даводзіцца кантраляваць і наведванне лекцый, і паспяховасць, і нават быт і жыццё студэнтаў пасля лекцый. Яны

**(Заканчэнне на 5 стар.)**

### ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

*Віншуем нашых юбіляраў і нагадваем, калі і каго можна павіншаваць з нагоды юбілею.*

2 сакавіка - Юрыя Генрыхавіча ***СЦЁПІНА*** - старшага выкладчыка кафедры прыкладной матэматыкі.

3 сакавіка - Дар'ю Мікалаеўну ***КАРАЦІНСКУЮ*** - дацэнта кафедры беларускай мовы.

5 сакавіка - Галіну Мікалаеўну ***БУБЛІК*** - метадыста вышэйшай катэгорыі навучальнага аддзела.

6 сакавіка - Міхаіла Юр'евіча ***СЯРЭНКА*** - старшага выкладчыка кафедры прыкладной оптыкі.

10 сакавіка - Уладзіміра Ігнатавіча ***САРОКІНА*** - вядучага лабаранта кафедры лазернай фізікі [illegible]пектраскапіі.

12 сакавіка - Лізавету Паўлаўну ***АНТАНОЎСКУЮ*** - гардэробшчыцу.

21 сакавіка - Валянціну Валянцінаўну ***ПІЛЕЦ*** - інжынера першай катэгорыі навуковага аддзела.

29 сакавіка - Раісу Аляксееўну ***СКАРАБАГАТАВУ*** - дацэнта кафедры экалогіі.

### КАРОТКІМ РАДКОМ

З 28 студзеня па 6 лютага праводзілася першынство універсітэта па [illegible]іні-футболу сярод выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У выйгрышы засталіся ўсе ўдзельнікі, якія весела, а, галоўнае, з карысцю для здароўя, правялі час у спартыўнай зале.

На абмеркаванне вучонага Савета было вынесена пытанне аб утварэнні на базе аддзялення міжнародных эканамічных адносін факультэта эканомікі. На гэтым факультэце будуць рыхтаваць кадры па спецыяльнасцях эканоміка і кіраванне, дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне, камерцыйная дзейнасць.

Пачала сваю работу прыёмная камісія універсітэта. На першых жа пасяджэннях абмяркоўваліся пытанні прыёму абітурыентаў на 1997-1998 г. Хутка ўбачаць свет новыя правілы прыёму.

## Галина ОСИПОВА: ПОТЕНЦИАЛ ЖЕНЩИНЫ НЕИСЧЕРПАЕМ

**Наши интервью**

*О женщине написано много замечательных произведений. Ей посвящено творчество лучших мастеров кисти, пера. И все-таки женщина как была сотни лет назад загадкой и тайной за семью печатями, так и осталась таковой до сегодняшних дней. В этом еще раз можно убедиться, встретив целеустремленную натуру, Личность с большой буквы, оптимистку и в то же время ранимую и тонкую душу, беззащитную перед хамством и подобными ему реалиями.*

*Сегодня предлагаем нашим читателям интервью с доцентом кафедры гражданского права и процесса, кандидатом юридических наук Галиной Тухтаровной Осиповой. Выбор не случаен: в этой женщине сочетаются лучшие качества лучшей половины человечества: прекрасный педагог, любящая и заботливая мать, ученый и предприниматель, политик, опытный юрист.*

**- Галина Тухтаровна, в Ваших жилах течет кровь казахских степняков, и наш древний задумчивый город для Вас не совсем родной. Как Вы себя здесь чувствуете?**

- Хорошо - это слабо будет сказано. Когда я впервые приехала в Гродно - а было это в год преобразования пединститута в университет - вышла ранним утром, где-то в четыре часа, на перрон, и огляделась, мне показалось, что попала в сказку Андерсена. Чистый, уютный, с ав-

**(Заканчэнне на 2 стар.)**



**Афіцыйна**

# НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

На студзеньскім вучоным Савеце разглядаліся найбольш важныя злабадзённыя пытанні універсітэцкай дзейнасці. Як звычайна, на пасяджэнні Савета прайшло выбранне па конкурсу і прысваенне вучоных званняў.

Вялікую цікавасць выклікала справаздача прарэктара па навуцы С.А. Маскевіча аб навукова-даследчай працы універсітэта за мінулы год. Навука развіваецца, назіраецца тэндэнцыя да росту даследаванняў. 282 выкладчыкі маюць вучоную ступень. Гэта - больш палавіны ўсяго выкладчыцкага калектыву. 25 чалавек маюць доктарскую ступень, 227 - кандыдацкую, 126 чалавек вучацца ў аспірантуры. Наш універсітэт па падрыхтоўцы навукоўцаў на трэцім месцы ў рэспубліцы, па колькасці апублікаваных навуковых працаў значна пераўзыходзіць Гомельскі і некаторыя іншыя аналагічныя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Аб стане і перспектывах фінансуемых навуковых даследаванняў расказаў начальнік навукова-даследчага сектара В.В. Сянько.

Акрамя асноўных пытанняў разглядаліся таксама надзённыя: аб зацвярджэнні часовага палажэння аб фінансаванні камандзіровак і стажыровак выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта, аб арганізацыі факультэта эканомікі, аб зацвярджэнні вучэбных праграм, аб іменных стыпендыях.

# АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На пасяджэнні рэктарата 27 студзеня абмяркоўвалася пытанне аб арганізацыі навучальнай практыкі на гуманітарным факультэце. З інфармацыяй на гэту тэму выступіла загадчык практыкі універсітэта В.А. Горская.

- Сучасны спецыяліст павінен валодаць навыкамі навукова-даследчай і арганізатарскай работы, - адзначыла Вера Аляксандраўна. - А фармаванне першасных прафесійных навыкаў адбываецца на практыцы. Таму падыходзім да гэтай справы сур'ёзна.

Якая структура практыкі? Пачынаецца яна ўжо з другога курса. Студэнты факультэта правазнаўства і эканомікі маюць магчымасць працаваць па спецыяльнасці на прадпрыемствах, у аблвыканкаме, у судах, пракуратурах. Некалькі тыдняў за семестр даюць магчымасць бліжэй пазнаёміцца з прафесіяй, а ўжо на пераддыпломную практыку будучыя спецыялісты прыходзяць падрыхтаванымі.

Праграмы практыкі для студэнтаў факультэта права і эканомікі перавыдадзены з улікам змяненняў. Ёсць праграмы і для аддзялення МЭА.

Студэнты факультэта замежных моў таксама праходзяць практыку ў адпаведнасці з праграмай, у якой прадугледжана практыка ў школе, практыка перакладчыка.

Але, каб улічыць усе патрабаванні сённяшняга дня, патрэбна мець скразную праграму практыкі. Трэба ўлічваць і тое, што ў горадзе ёсць недзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, якія рыхтуюць выпускнікоў па тых жа спецыяльнасцях, што і універсітэт. З улікам гэтага трэба мяняць і падыход да практыкі. Як? Гэта ўжо справа факультэта.

На сённяшні ж дзень на факультэтах удзяляецца дастатковая ўвага практыцы студэнтаў. Вынікі яе абмяркоўваюцца на савеце факультэта, улічваюцца памылкі. Вядома, ёсць і праблемы, ёсць пытанні, якія неабходна вырашаць. Напрыклад, няма палажэння аб практыцы на гуманітарным факультэце. Настала пара падумаць і пра аплату кіраўнікам практыкі. Студэнтам трэба пісаць справаздачу аб практыцы, увесці дыферэнцаваны залік.

У абмеркаванні пытання аб арганізацыі практыкі члены рэктарата прынялі актыўны ўдзел. Былі ўнесены цікавыя прапановы: разглядаць праграму практыкі на метадычным савеце універсітэта, увесці пасаду кіраўніка вытворчай практыкі з тым, каб падыход да гэтай важнай справы быў больш дыферэнцаваным і канкрэтным.

* * *

Падрыхтоўка да атэстацыі вышэйшых навучальных устаноў - такой была тэма чарговага пасяджэння рэктарата. Праведзена праверка пяці факультэтаў: гісторыі і культуры, біялогіі і экалогіі, фізіка-тэхнічнага і педагогікі і псіхалогіі. Аб выніках праверкі, заўвагах расказалі дэканы і прадстаўнікі гэтых факультэтаў. Вынікі паказалі, што ў напрамку справаводства ёсць над чым працаваць. Патрэбен унутрыуніверсітэцкі стандарт, дзе ўсё павінна быць распісана.

Аб заўвагах, якія выявіла камісія, расказала начальнік навучальна-метадычнага аддзела Т.А. Бадзюкова. Зроблены сур'ёзныя заўвагі па вядзенні дакументацыі на ўсіх факультэтах. Але варта сказаць, што на факультэце гісторыі і культуры справа пастаўлена крыху лепш.

(Пачатак на 1 стар.)

густовским разноцветьем в палисадниках, Гродно встретил нас, как родных. Открывался факультет права, и нас с мужем пригласили работать в университет из Караганды, где мы преподавали право. А закончила я юридический факультет КазГУ им. С.М. Кирова в 1974 году. Здесь, в Гродно, чувствую себя дома. Что касается национальности, то главное, наверно, не в этом. Хотя считаю, что и язык, и культура каждого народа - это важно. Благодаря этому укрепляется государство. Мне очень нравится белорусский, традиции и культура белорусов, сами люди. Мои дети знают белорусский язык. Антон учится на факультете права, уже на 3 курсе. А Даша - десятиклассница. Сейчас она в Америке, изучает английский, французский. Дети - на первом месте для каждой женщины. И я, конечно, не исключение.

## Галина ОСИПОВА: ПОТЕНЦИАЛ ЖЕНЩИНЫ НЕИСЧЕРПАЕМ

**- Но Вы и политик. Зачем женщине политика? Разве можем мы что-то решить или изменить в этом чисто мужском деле?**

- Можем. Должны. Особенно юристы, которые долгое время были вне политики, чтобы быть беспристрастными. Но за это пришлось расплачиваться народу: законы несовершенны, не работают. Именно сейчас, на переломе тысячелетий, юристы должны сделать реальный вклад в развитие общества. Через право можно влиять на экономику, право может тормозить реформы или содействовать им. Законы должны издавать профессиональные юристы. Дважды я баллотировалась кандидатом в депутаты Верховного Совета. Не прошла. Но руки не сложила. Работаю. Состою в партии объединенного гражданского согласия С. Богданкевича.

**- Вы ведете прием как член Хельсинкского комитета по защите прав человека. Скажите, часто ли нарушаются права человека в Беларуси?**

- К сожалению, да. Это и незаконные задержания, и имущественные вопросы, и многое другое. А идет все от незнания: как тех, кто нарушает, так и тех, чьи права нарушаются. Жаль, что наши же выпускники - юристы на местах допускают ошибки. Часто звонят из районов, приезжают. Люди, столкнувшись с законом, зачастую не знают, как себя вести, не знают, куда обращаться, не знают своих прав. Белорусский Хельсинкский комитет будет скоро официально зарегистрирован. Пока издали бюллетень, готовим второй, готовим[illegible]ситетом совместную ме[illegible]одную конференцию американских юристов.

**- Какую часть жизни занимает бизнес, Ваша фирма?**

- Фирма "Польский бизнес" существует пять лет. В начале 90-х в Польше вышла моя книжка "Как делать бизнес в СССР". Тогда все еще только начиналось, это было интересно. Меня начали приглашать за границу на конференции, выставки и ярмарки. Поняла, что мы просто обречены на сотрудничество с этой страной, связаны с ней, причем и на уровне личных, родственных связей гродненцы с поляками идут рядом. Это все навело на мысль создать фирму, чтобы привлечь инвестиции, защищать интересы тех, кто сотрудничает с соседями. Планировала, что в фирме будут проходить практику мои студенты. Вначале так и было. По мере того, как работа усложнялась, фирма разворачивалась и набирала размах, пришлось подход менять. Сейчас у меня работают юристы с лицензиями. Мы уже во всех зарубежных справочниках и каталогах, участвуем в конференциях. Работы бывает много: и с гражданами, и с польским консульством. Фирма отнимает большую часть времени, и все-таки я в первую очередь - педагог. Педстаж у меня - 23 года. Вначале читала очень много курсов. Тогда, во время становления факультета, все курсы читали всего три человека. Сейчас лекций у меня меньше, но читаю с удовольствием, я бы сказала, с упоением, без конспектов и записей, глядя студентам в глаза. Они воспринимают мои лекции хорошо.

**- Галина Тухтаровна, можно ли сказать, что Ваша женская судьба состоялась, что Вы реализовались полностью?**

- Этого, наверно, никогда нельзя сказать, потому что всегда чего-то не хватает для полного удовлетворения. Я реализовала главное предназначение - материнство. В этом - счастье. Но что-то в личной жизни не сложилось, или сложилось не так, как хотелось бы. Не заостряю внимания на неудачах. Некогда. Придерживаюсь феминистических взглядов, думаю, что когда-нибудь создам в городе клуб феминисток. Ведь женский потенциал неисчерпаем, а женщина в нашем обществе как индивидуум еще не раскрылась, не реализовала свои возможности до конца. Есть, например, профессии, где могут работать только женщины. Почему? Да потому, что мы сильнее мужчин...

**Беседу вела Л. Данилова.**



# ВІЗІТЫ, КАНТАКТЫ

У рамках сумеснага праекта ТЕМПУС-ТАСІС у нашым універсітэце з візітам пабываў прафесар с Даніі Лейр Таге Ольсан. Госць пазнаёміўся з універсітэтам, з калегамі. А потым адбыліся дыскусіі і абмеркаванні пытанняў, якія цікавілі абодва бакі.

* * *

З 16 па 20 лістапада ў Гродне пабывала дэлегацыя з універсітэта Варвіка (Англія). Нашымі гасцямі былі дырэктар аддзела сувязяў са школамі і каледжамі Розмары Стэмп і старшы памочнік дырэктара універсітэта Кэці Чарльтан.

* * *

25 лістапада ў Англію паехала наша дэлегацыя, у склад якой увайшлі прарэктар універсітэта С.А. Маскевіч, начальнік навукова-даследчага сектара В.В. Сянько і загадчык аддзела міжнародных сувязяў І.Б. Захарчанка. А ў пачатку снежня універсітэцкая дэлегацыя пабывала ў Італіі. У яе склад увайшлі прарэктар, доктар фізіка-матэматычных навук С.А. Маскевіч, начальнік вучэбнага аддзела, кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю.Ю. Гняздоўскі, супрацоўнік аддзела замежных сувязяў кандыдат фізіка-матэматычных навук Ю.А. Вайтукевіч.

* * *

Па запрашэнні інстытута ўсходнеславянскай філалогіі Рэспублікі Польшча прафесар кафедры беларускай мовы нашага універсітэта Іван Якаўлевіч Лепешаў у пачатку наступнага года будзе чытаць цыкл лекцый па фразеалогіі беларускай мовы ў Беластоку, у філіяле Варшаўскага універсітэта. Усе выдаткі на праезд, пражыванне і харчаванне нясе польскі бок, які запрашае нашага прафесара.

# "НА ПРАСТОР! НА ШЫРОКІ ПРАСТОР!.."

У лісце да Максіма Танка адзін яго замежны сябра неяк напісаў: "У канцы гэтага, XX стагоддзя, людзі ведаюць адны пра другіх параўнальна больш, чым калі б гэта ні было раней. Аднак, нягледзячы на такі факт, яны, як мне здаецца, аддалены адзін ад аднаго".

Узгадаліся гэтыя словы тады, калі перад сваёй паездкай у Польшчу прыйшлося мне перапытаць добры тузін знаёмых, каб нешта даведацца аб невялікім горадзе Аполлі. А вось жа, здавалася, і ведаем сваіх заходніх суседзяў... А горад гэты ўтульна размясціўся на рацэ Одры ў куточку паміж Германіяй і Чэхіяй.

У канцы верасня 1996 года ў Апольскім універсітэце пачала працу міжнародная навуковая канферэнцыя "Мова і літаратура ўсходніх славян. Сучасны стан і тэндэнцыі развіцця." Абмяняцца думкамі па актуальных праблемах усходнеславянскіх моў і літаратур, сумесна абмеркаваць шляхі развіцця філалагічнай навукі сабраліся навукоўцы з 16 краін свету, у тым ліку з Італіі, Японіі і многіх іншых краін Усходняй і Заходняй Еўропы. Усяго канферэнцыя налічвала каля 200 удзельнікаў. На працягу трох дзён была створана цудоўная атмасфера для абмену думкамі, для замацавання навуковых сувязяў.

У першы дзень удзельнікаў канферэнцыі вітала кіраўніцтва Апольскага універсітэту, вядучыя навукоўцы краін Захаду, якія і стварылі добры працоўны настрой на ўсе наступныя дні. У гэты ж дзень адбылася прэзентацыя кнігі прафесара Вольфганга Казака (Кёльн). "Лексікон рускай літаратуры XX ст.," пададзенай у польскім перакладзе і навуковай рэдакцыі прафесарам кафедры беларускай і ўкраінскай славістыкі Апольскага універсітэта Браніславам Кодзісам. На публічную гутарку па кнізе прафесара В.Казака былі запрошаны ўсе ўдзельнікі канферэнцыі. У гэты ж дзень навукоўцы пачалі працу ў літаратуразнаўчых і мовазнаўчых секцыях.

Нельга не адзначыць шырокай разнастайнасці тэматыкі дакладаў і выступленняў, прысвечаных праблемам літаратуры. Прамоўцамі закраналася праблема духоўнасці ў творах пісьменнікаў розных нацыянальных літаратур, асвятляліся малавядомыя старонкі творчасці пісьменнікаў, забароненых і забытых у свой час. Прыемна было адзначыць, што навукоўцы не абмяжоўваліся ўвагай да праблем уласна нацыянальнай літаратуры, а паказалі сваю зацікаўленасць ходам літаратурнага жыцця іншых славянскіх краін. Так, Ірэна Хубіцка (Гданьск) звярнулася да аналізу жаночых вобразаў у прозе Л. Петрушэўскай. Ян Чос прадэманстраваў дасведчанасць у творчасці ўкраінскіх пісьменнікаў, што працуюць у жанры гістарычнай прозы.

Да беларускай літаратуры таксама праявілі значны інтарэс замежныя навукоўцы, у прыватнасці, выкладчык кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта Надзея Панасюк звярнулася да рэлігійных матываў у творчасці сучасных беларускіх паэтаў. Хелена Глоговска (Гданьск) апавядала пра спецыфіку ўспрыняцця беларускай дзіцячай літаратуры XX ст. у Польшчы. Аб тым, што цікавасць да беларускай літаратуры пашыраецца, засведчыў малады навукоўца з Аполля Томаш Вельк, пазнаёміўшы з сучасным успрыняццем твораў В. Быкава ў польскамоўным асяродку.

Відавочным у гэтым плане было тое, што ў беларускай літаратуры замежныя навукоўцы не толькі змаглі абазначыць адметныя бакі нацыянальнага жыцця, але і знайшлі ў ёй духоўны імпульс для ўзбагачэння ўласнай літаратуры і культуры.

Змястоўнымі і актуальнымі з'явіліся даклады і выступленні па праблемах мовазнаўства. Прычым менавіта сярод гэтых навукоўцаў актыўна праводзіліся дыскусіі і абмеркаванні, часам выказваліся амаль палярныя погляды па некаторых спрэчных пытаннях мовазнаўства. Сярод вызначаных праблем найбольшую цікавасць выклікалі наступныя: праблема суадносін наратыўнага і камунікатыўнага тэксту (з пункту гледжання культуры мовы), структура і змест дапаможнікаў па рускай мове для замежных студэнтаў, а таксама і праблема авалодання іншымі ўсходнеславянскімі мовамі поруч з рускай. У рабоце канферэнцыі прынялі ўдзел вядомыя мовазнаўцы: Мая Усеваладава (Масква), Зоя Кёстэр-Тома (Берлін), Рэйнгольд Сяроў (Патсдам), Герман Бідэр (Зальцбург) і многія іншыя. У заключнай частцы канферэнцыі многімі навукоўцамі было падкрэслена, што яшчэ значнае кола праблем чакае свайго абмеркавання і даследвання. Адзначалася, што падобныя мерапрыемствы істотна ўзбагачаюць шырокія перспектывы для супрацоўніцтва, пашыраюць сувязі паміж краінамі. З кожнага боку адчувалася імкненне да агульнага дыялогу, да ўзаемадзеяння. І можна спадзявацца, што такія сувязі будуць развівацца, стануць больш плённымі і багатымі. І што аматары і даследчыкі роднай мовы і літаратуры атрымаюць надзею на новыя цікавыя сустрэчы і не толькі на Еўрапейскім узроўні.

Канкрэтныя крокі ў міжнародным супрацоўніцтве можна зрабіць ужо і сёння. Наш універсітэт мае пагадненне па навуковаму супрацоўніцтву з Апольскім універсітэтам. Таму звяртаемся да кіраўніцтва гістарычнага факультэта, факультэта філалогіі з просьбай падаць канкрэтныя прапановы па супрацоўніцтву ў аддзел міжнародных сувязей універсітэта.

*С. ТАРАСАВА,*
*выкладчык кафедры беларускай літаратуры.*



# ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

14 лютага святкавалі дзень Святога Валянціна, дзень закаханых. Не трэба лішні раз нагадваць, што гэта менавіта наша, студэнцкае свята. Бо калі ж яно, каханне, і прыходзіць, як не ў студэнцкія гады? Вось чаму адзначаў дзень Святога Валянціна ўвесь універсітэт. Праўда, гэта такое свята, якое не выстаўляецца напаказ, і атрыбутыка яго без маляўнічых плакатаў і афішаў. Толькі патаемны пагляд, толькі трапяткія пальцы ды яшчэ паскораны сардэчны рытм, адхіленні ў пульсе і дыханні...

У пятніцу раніцай пачала працаваць пошта для закаханых. Аб'ява запрашала тых, хто хоча памірыцца з каханым(ай), альбо паведаць ёй ці яму аб пачуццях, марах, ці прызнацца ў каханні, апусціць у скрынку "валянцінку". Вядома, хтосьці засумняваўся: а ці не даведаюцца аб пасланні сябры? Ці не пачнуць кпіць? Можам пацвердзіць: усё засталося ў тайне, "валянцінкі" дайшлі да адрасатаў.

А ў 19 гадзін у галоўным корпусе пачалася шоу-праграма з дыскатэкай, конкурсамі, дэманстрацыяй мадэляў, вясельных убораў, і не толькі. Дарэчы, для Валянцін і Валянцінаў уваход быў свабодны, па студэнцкіх білетах. Святкавалі весела, было аб чым успамінаць на лекцыях.

# ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫІ

Па выніках экзаменацыйнай сесіі ўстаноўлены імянныя стыпендыі студэнтам, якія вучацца на "выдатна" і актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці універсітэта.

Так, да імянных стыпендый прадстаўлены наступныя студэнты:

- да стыпендыі імя Я. Карскага - студэнт 3 курса трэцяй групы факультэта замежных моў **Аляксей МАЦЭВІЛА**;
- да стыпендыі імя М. Багдановіча - студэнт 3 курса трэцяй групы факультэта права і эканомікі (МЭА) **Аляксандр КАНЕЦКІ**;
- да стыпендыі імя Я. Коласа - студэнтка 4 курса першай групы факультэта філалогіі **Аксана ДУДКО**;
- да стыпендыі імя П. Броўкі - студэнт 5 курса трэцяй групы факультэта біялогіі і экалогіі **Аляксандр КАРЭЎСКІ**;
- да стыпендыі імя Ф.Скарыны - студэнт 4 курса першай групы факультэта гісторыі і культуры **Сяргей ПАВАЧКА** і студэнт 4 курса 1 групы фізіка-тэхнічнага факультэта **Аляксандр БАРЫСЕНАК**.

**Фотарэпартаж**

# ДРУЖНЫ КАЛЕКТЫЎ







Кажуць, што ў жаночых калектывах ладу не бывае. А ў разліковай групе, ці, прасцей кажучы, бухгалтэрыі працуе дружны калектыў. Праўда, і тут спакойных і ціхіх часін не бывае. То зарплата, то стыпендыя, то надбаўкі, то пералік. Амаль кожны месяц нясе нейкія змены. Што ж, няма стабільнасці сёння ні ў заробку, ні ў стыпендыі.

- Прыемна рабіць пералік, калі павялічваюцца стаўкі, - гаворыць Фаіна Іосіфаўна Пазняк. - Гэта ж робіцца для людзей, для нашых выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў...

Фаіна Іосіфаўна - вопытны бухгалтар, толькі ва універсітэце працуе 23 гады. А Фіра Пятроўна Фрэнкель тут ужо 28 гадоў. Ветэраны дапамагалі станаўленню тых, хто прыйшоў пазней. Ды і сёння часта да іх звяртаюцца за парадай.

У калектыве не бывае канфліктаў, якія б адбіваліся на выніках работы. Добры маральна-псіхалагічны клімат дапамог і таксама даволі хутка засвоіць работу на камп'ютары. Цяпер усе разлікі праводзяцца толькі такім метадам. Ранейшыя атрыбуты - костачкавыя лічыльнікі, арыфмометры - даўно адышлі ў нябыт. Але памыліцца можна і на камп'ютары. Таму тут і пануюць цішыня і той працоўны настрой, які спрыяе хуткай і дакладнай разліковай рабоце.

**На здымках: злева направа - ветэраны разліковай групы Ф.І. Пазняк і Ф.П. Фрэнкель; галоўны бухгалтар Т.А. Герашчанка; Т.С. Чмель, Т.М. Рашэўская і Л.У. Хацян за работай.**

**Фота Ул. Сарокіна**

# КОЛЬКІ КАШТУЕ НАВУЧАННЕ

**А. БЕЛАВУСАЎ,**
**намеснік дэкана гуманітарнага факультэта**

У нашым універсітэце на дагаворнай падставе на дзённай і завочнай формах навучаецца больш за 2000 студэнтаў. Адной з умоў дагавора аб падрыхтоўцы спецыялістаў з'яўляецца абавязак студэнта або прадпрыемства, якое робіць заказ на падрыхтоўку спецыялістаў, кампенсаваць выдаткі універсітэта, звязаныя з навучаннем.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 05.11.96 г. N 453 адменены абмежаванні памеру платы за навучанне ў 50 мінімальных заробтных плат для дзяржаўных вну. Прадугледжана, што кошт платнага навучання ў дзяржаўнай вну не павінен перавышаць фактычных затрат на падрыхтоўку спецыяліста. Сродкі, атрыманыя ад платнага навучання, накіроўваюцца на аплату працы прафесарска-выкладчыцкага персаналу, абнаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы, вучэбна-метадычнае забеспячэнне і гаспадарчыя патрэбы.

У пачатку 1997 года значна ўзраслі затраты універсітэта на падрыхтоўку спецыялістаў, што ў першую чаргу абумоўлена павелічэннем памеру мінімальнай заработнай платы і тарыфнай стаўкі першага разраду (з 110.000 руб. да 145.000 руб.), платы за камунальныя паслугі, ростам кошту абсталявання, аргтэхнікі і іншых тэхнічных сродкаў.

У сувязі з гэтым загадамі рэктара № 21 і 22 ад 14.01.97 г. устаноўлена дыферэнцаваная аплата за навучанне. Памер яе залежыць ад спецыяльнасці, формы і курса навучання студэнта.

З 01.01.97 года ва універсітэце ўстаноўлены прыведзеныя ў табліцы памеры платы за навучанне для студэнтаў, якія займаюцца на дагаворнай падставе.

Для студэнтаў, якія паступілі ва універсітэт па выніках субяседвання, або былі пераведзены з камерцыйных (недзяржаўных) вну, памер аплаты павялічваецца на 30%. Апошні тэрмін унясення аплаты скончыўся 1 сакавіка 1997 года.

Такім чынам, зыходзячы з рыначнага курса долара (1 USD= = 24.000 - 25.000 руб.), сярэдні памер аплаты за навучанне ва універсітэце на дзённай форме складае - 400 USD, а на завочнай - 250 USD.

Для параўнання, памер аплаты за навучанне ў некаторых гродзенскіх камерцыйных вну: КУК - 700-750 USD/год; ІСВ - 55 USD у месяц.

| Спецыяльнасць, курс навучання | Памер аплаты (тыс. руб.) | |
|---|---|---|
| | дзённая форма | завочная форма |
| правазнаўства, МЭА, псіхалогія, эканамічная кібернэтыка, інжынерныя спецыяльнасці: | | |
| І курс | 9.400.000 | 6.985.000 |
| ІІ-V (VI) курс | 8.435.000 | 6.000.000 |
| замежныя мовы: | | |
| І курс | 11.815.000 | — |
| ІІ-V (VI) курс | 8.435.000 | — |
| педагагічныя спецыяльнасці: | | |
| І курс | 7.950.000 | 5.335.000 |
| ІІ-V (VI) курс | 7.465.000 | 5.335.000 |

# Няхай здзяйсняюцца мары



## ВІНШУЕМ!

Начальніка навукова-даследчага сектара В.В. Сянько з перамогай у конкурсе "Падключэнне абласцей Рэспублікі Беларусь да сеткі INTERNET".

На сумесны конкурс Беларускага Фонда Сораса і фонда "Еўразія" паступіла 38 заявак. Эксперты прызналі пераможцамі 7 праектаў. Агульная сума фінансавай падтрымкі - 100.000 долараў ЗША.

Сутнасць праекта В.В. Сянько - стварэнне на базе цэнтра электронных камунікацый Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы вузла міжнароднай камп'ютарнай сеткі INTERNET.

## БУДЗЕ ФІЛІЯЛ

Універсітэт праводзіць вялікую работу па ўдасканаленні сістэмы адукацыі ў рэгіёне. Ствараюцца прынцыпова новыя адукацыйныя школы-ліцэі, каледжы, у якіх моладзь можа атрымаць сучасныя спецыяльнасці. Так, пачалася падрыхтоўка да адкрыцця ў Лідзе абласнога занальнага шматпрофільнага ліцэя. А на базе педвучылішча ў Лідзе будзе каледж. Акрамя таго, падпісаны пратакол аб адкрыцці філіяла універсітэта ў горадзе Ліда на базе індустрыяльнага тэхнікума.

У лідскай зоне - некалькі раёнаў. Працуе там каля трохсот настаўнікаў пачатковых школ, якія не маюць вышэйшай адукацыі. Адкрыццё філіяла дапаможа ўзняць кваліфікацыйны ўзровень настаўнікаў, а таксама папоўніць недахоп кадраў.

Вядома, у сувязі з гэтым узнікае шмат праблемаў: навучальная база, інтэрнаты, база харчавання, кадры. Але мяркуецца ўжо з наступнага навучальнага года пачаць работу.

## ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ НАВУКІ

У нашым універсітэце планамерна развіваюцца грунтоўныя навукі. Толькі на фізіка-тэхнічным факультэце навукоўцы абаранілі 4 доктарскія і 48 кандыдацкіх дысертацый. Раней нашы фізікі супрацоўнічалі з вядучымі навучальнымі ўстановамі Расіі, укараняліся ў вытворчасць навуковыя здабыткі. На жаль, цяпер няма пасрэднікаў, няма і доследна-канструктарскай базы. Не хапае сродкаў, каб набыць новае абсталяванне.

Але ўсё ж такі ёсць падстава меркаваць, што дасягненні навукоўцаў будуць запатрабаваны, бо дзяржава ў іх зацікаўлена. Стала вядома, што па ініцыятыве рэктара універсітэта прафесара Л.М.Ківача дасягнута дамоўленасць паміж адпаведнымі міністэрствамі аб перадачы з балансу на баланс пустуючай сёння плошчы з вытворчымі карпусамі радыёаб'яднання "Хваля" універсітэту. Плануецца тут размясціць вытворча-навуковы комплекс на базе фізіка-тэхнічнага факультэта. Вядома, немалыя сродкі давядзецца затраціць на рэканструкцыю. Але гэта акупіцца рэальнай дапамогай рэгіёну ў развіцці эканомікі, укараненнем навуковых дасягненняў у вытворчасць.



Здаецца, зусім нядаўна для іх празвінеў апошні школьны званок. Наташа і Таня сярэднюю школу скончылі з залатым і сярэбраным медалямі. У родным Скідзелі ўсе суседзі і сябры ведалі, што ў гэтых дзяўчат дарога адна - ў педагогі. Бо, як адна, так і другая - з сям'і настаўнікаў, аб школе марылі з дзяцінства.

Стаўшы студэнткамі факультэта педагогікі і псіхалогіі, Наталля Рэкець і Таццяна Арлова сталі і сапраўднымі сяброўкамі: на першым курсе паехалі на ўборку бульбы, жылі разам на кватэры. Шмат агульнага ў іх характарах. Абедзве вучацца выдатна, хутчэй за ўсё, атрымаюць чырвоныя дыпломы.

За плячыма - пяць гадоў вучобы з нечаканасцямі, радасцямі, хваляваннямі. Але тое, што чакае, хвалюе больш. У канцы сакавіка - размеркаванне, а потым - самастойная праца. Выпускніцы змогуць працаваць выхавацелямі, метадыстамі, педагогамі-арганізатарамі. А хацелася б, вядома, настаўніцамі пачатковых класаў.

Што ж, пажадаем сяброўкам удачы на парозе жыцця. Няхай здзяйсняюцца мары!

**На здымку: студэнткі 5 курса факультэта педагогікі і псіхалогіі Наталля Рэкець і Таццяна Арлова.**

**Фота Ул. Сарокіна.**

# ПЕРШЫ ПАМОЧНІК

**(Пачатак на 1 стар.)**

жывуць у асноўным у інтэрнаце па вул. Даватара, побач з вучэбным корпусам. І яна - часты госць у інтэрнаце.

- Наша Крысціна Зыгмундаўна, - гавораць студэнты, - нам і за бацьку, і за маці. Калі што трэба - звяртаемся да яе. Заўсёды дапаможа. Добрую параду дасць, канкрэтна можа пасадзейнічаць і паспрыяць студэнту. Усё і добрае, і непрыемнае да нас даходзіць праз нашага метадыста. А яна - чалавек чулы, добразычлівы.

Задоўга да зімовай сесіі Крысціна Зыгмундаўна абагульніла вынікі прамежкавай атэстацыі студэнтаў першага курса і забіла трывогу: у некаторых - амаль усе двойкі. У чым прычына? Магчыма, трэба пагаварыць са студэнтам? Можа, варта паведаміць бацькам - усё ж такі першы курс, разгубіліся, няма ўрокаў, як у школе, дрэнна рыхтуюцца да заняткаў? Крысціна Зыгмундаўна, як заўсёды, прыме правільнае рашэнне, дапаможа студэнту.

К.З. Варэйка добра ведае праблемы студэнцкага жыцця, цяжкасці ў рабоце факультэта. Напрыклад, ускладняецца навучальны працэс з прычыны таго, што заняткі на факультэце правазнаўства - заўсёды ў другую змену, у розных аўдыторыях, нават у розных памяшканнях. Зрабіць час лекцый больш кампактным, а пераходы з аўдыторыі ў аўдыторыю - спрошчанымі, каб гэта ўсё не адбівалася на навучальным працэсе - задача складаная. Метадыст К. Варэйка ўмее спалучаць самыя складаныя, на першы погляд, з'явы і суадносіны, і рабіць так, каб было зручна і выкладчыкам, і студэнтам.

Яна заўсёды ў руху, у справах, вольнай хвіліны не знойдзецца за дзень, які іншы раз цягнецца з 9 гадзін раніцы да 20 гадзін вечара, асабліва, калі ідзе сесія. Тады не толькі субота, а і нядзеля - рабочы дзень. К. Варэйка сама калісьці была студэнткай, скончыла філалагічны факультэт нашага універсітэта. Студэнцкае жыццё, жыццё факультэта ведае, любіць, і, мабыць, не ўяўляе сябе на другім месцы. Сама яна аб сваёй рабоце гаворыць так:

- Метадыст — не прафесія. Гэта — прызванне.

Мабыць, так і ёсць, бо далёка не кожны чалавек змог бы так арганічна, так натуральна ўпісацца ў гэтае жыццё, стаць галоўным звяном, аб'ядноўваючым традыцыйную звязку: дэкан-кафедра-студэнт.

**Т. БАДЗЮКОВА,**
**дацэнт, начальнік вучэбна-метадычнага аддзела.**

*На здымку: метадыст факультэта права і эканомікі К.З. Варэйка са студэнтамі.*

**Фота Ул. Сарокіна.**

**_Внимание: конкурс!_**

# *Хотите "видик"?*

Республиканский центр здоровья Министерства здравоохранения Республики Беларусь объявляет конкурс "Молодые-молодым" на лучший материал об области зависимостей: наркомания, алкоголизм, токсикомания, курение. Цель конкурса - выявление наиболее эффективных и убедительных, с точки зрения молодых людей, форм медицинского просвещения и наглядной агитации в области профилактики зависимостей. Критерии оценки - оригинальность содержания и формы, направленность на конкретную возрастную категорию, убедительность, доступность для восприятия, достоверность изложенных фактов.

Представленные материалы могут быть как в виде проектов, эскизов, так и в законченном виде. Выбирайте номинацию, соответствующую вашему материалу: лекция, беседа, памятка, буклет, листовка, плакат, стенгазета, бюллетень. Малые формы - закладки, значки, календари; массовые мероприятия - танцевальный вечер, массовое шествие и т.д.; сценарии телевизионных передач, конкурсов, игр; компьютерные образовательные программы, компьютерные игры; аудио, видеопродукция (клип, ролик, песня); другое. Материалы подаются по адресу: **220099 г. Минск, ул Казинца, 50-А. Республиканский центр здоровья с пометкой на конкурс "Молодые-молодым". Телефон для справок: 277-54-05.**

Спонсор конкурса: Jellenek-центр по профилактике и лечению зависимостей, Нидерланды.

Призовой фонд конкурса: I место - пишущий видеоплейер, II-III места - фотоаппараты. Кроме того, предусмотрены поощрительные призы для победителей в каждой комбинации.

Попробуйте! Вспомните, что не боги горшки обжигали!



# "НАДНЁМАНСКІЯ ГАЛАСЫ": НОВЫЯ ІМЁНЫ

*Вось - вось, чакаеш, мацней павее холадам і зацерушыць сняжком зіма.*

*А ў паэзіі пакуль яшчэ пануе восеньскі настрой. Што ж, усіх таленавітых людзей не пакідае раўнадушнай гэтая сапраўды цудоўная, таямнічая пара года. Пісалі аб ёй дзесяткі пакаленняў паэтаў. Пазбегнуць чараў восені здолелі нямногія... Адкрыць для сябе восень спрабаваў, я думаю, кожны паэт.*

*"О хараство асенніх дзён празрыстых..." - адзначаў у сваіх вершах Ул. Жылка. "Восень, ты цудоўная, восень дажджлівая..." - выказаўся аб гэтай пары года Цішка Гартны.*

*"Ёсць у восені ціхая-ціхая радасць..." - пажаночаму мякка сцвярджае Таіса Бондар.*

*Якімі б супярэчлівымі ні былі паэтычныя малюнкі восені, відавочна адна яўная заканамернасць - таямніца яе прыцягальнасці, яе хараства застаецца неразгаданай. Па вершах нашых маладых паэтаў можна меркаваць, што і для іх восень стала плённым у творчых адносінах часам. Іх вершы яшчэ раз сведчаць: восенню можна тварыць, восенню можна кахаць, восенню можна сумаваць, а можна яшчэ марыць і спадзявацца.*

*Святлана ТАРАСАВА,*
*кіраўнік літаб'яднання.*

## НА АРЭЛЯХ

*Уздыхаючай вераснёвай ноччу сяджу на арэлях, што змайстраваў для старэйшага сына ў нашым старым садзе.*

*Сад па-старэчы размаўляе з сабой, я слухаю сад, ноч глядзіць на нас. Гук падаючага ў халодную траву яблыка пераплятаецца-пераліваецца са шляхам знікаючай зоркі.*

*Гайдаюся на арэлях маёй памяці. Сузор'і ў ночвах купаюць маладзік. Некалі яблыкі былі смачнейшыя, а ноччу іх збіралі русалкі.*

*Дні падаюць у халодную траву забыцця.*
*Успаміны, як зоркі, пранізваюць душу.*
*Гайдаюся на арэлях. Бабуля іх - калыска, у ёй спіць мой малодшы сын. Яго яблыкі самыя смачныя ў нашым старым вераснёвым садзе.*

* * *

*Чалавек жыве ноччу. Яна адна. У ёй мы*
*сустракаемся з сабою. Дзён многа.*
*Яны абавязваюць нас сустрэчамі з іншымі.*
*Адзінокая поўня. У ёй адбіваецца*
*сонечнае святло. Зор - не злічыць, даходзяць*
*да нас іх састарэлыя промні.*
*Так жа ў нашым жыцці, у нашай начы*
*Ёсць нехта, хто шле нам*
*сонечнае святло*
*нават у цемры.*

*Анатоль РАМАНЧУК*

* * *

*Мы як дрэвы.*
*Мы з імі крэўна зрошчаны.*
*Наш лёс -*
*лёс Лесу -*
*бясконцае прарастанне да Сонца.*
*І цэлы народ - гэта пушча з*
*відушчай душою.*
*І ўсе мы - на ростанях.*
*Мы злучаны з Восенню*
*Ценем крыла.*
*Нас кранае пазнанне -*
*пазнанне дрэва -*
*карэннем туліцца да цела Зямлі*
*і*
*да святла прарывацца атожылкамі.*
*Святая праўда жыцця.*
*Я - дрэва.*

* * *

*Раніцай я падмятаю і палю*
*ўпаўшыя зоркі -*
*лёгкае лісце, што насыпала*
*ля ганка старая ліпа.*
*Вечар мой збірае ў гурбу*
*Няздзейсненыя дзённыя мары.*
*Ноччу гадзіннік меле на сваіх жорнах*
*Спелае збожжа майго быцця.*
*Зацярушвае мякінай падзей мае вочы.*
*Але раніцай моцная ліпа,*
*Грэючы старэчыя пальцы*
*ля майго акна,*
*Усміхаецца.*
*...Ёсць яшчэ лісце залатое...*

## ДАРОГА ДА ГОРАДА

*Раніцой вяртаюся*
*ў горад і бачу,*
*Як ён-небарака*
*бяжыць па дарозе*
*да Восені.*
*У абдымках слупоў нясе*
*дзіўны акварыум вуліц.*
*Пракураныя хмары цягнуць*
*на нітках антэн*
*геаметрычныя гмахі.*
*Восень. Горад.*
*Як ён цяжка ўздыхае -*
*трымаюць пасткі дратоў.*
*Восень спрабуе адкупіцца*
*сваім золатам.*
*Плача самотнымі дажджамі.*
*Горад. Гора.*
*Заміраюць выбухамі*
*ўзятыя ў палон*
*спалоханыя дрэвы.*
*У разбітым люстэрку*
*лужыны шукаю*
*яе сумны погляд.*
*Гора. Восень. Горад.*
*Дарога.*

*Святлана САЛЯНСКАЯ*

## ТРЫЯЛЕТЫ ВОСЕНІ

К. У.

I

Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць,
Як дрэвы глядзяцца ў просінь,
Маўкліва акіну паглядам.
Як быццам аб нечым нас просіць
Халодная, шэрая восень.
Маўкліва акіну паглядам,
Як вецер лістоту адносіць.

II

Хоць не вернеш назад усё гэта
Бераг. Сонца. Аблокі. Масток.
Памяць часам асвеціць здалёк
Успаміны шчаслівага лета.
І маленькага шчасця глыток
Будзе светам чароўным сагрэты,
Хоць не вернеш назад усё гэта -
Бераг. Сонца. Аблокі. Масток.

III

Як восень, жоўтаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула,
Хоць яркім полымем шугнула,
Ды не пакінула надзей.
Яго б назад я не вярнула,
Нашто мне цень былых падзей...
Як восень, жоўтаю ладдзёй
Нябачна шчасце прамільгнула.



*Васіліса ПАЗНУХОВА*

## ЗАМОВА

*З-за чорнага балота,*
*З-за густога чароту*
*Ідзе ўпотай*
*Панна Яснота.*
*У панны Ясноты*
*Чырвоныя боты,*
*Блакітныя вочы -*
*Яснеюць ночы.*
*Панна Яснота,*
*Тупні ты ботам!*
*Хай ліха пройдзе,*
*Хай людзям сыдзе*
*З сэрца - згрызота,*
*З душы - маркота,*
*З думак - турбота,*
*Са слоў - пустота,*
*З вачэй - самота,*
*З рук - лянота,*
*З хаты - бядота,*
*Са двара - галота,*
*З народа - нядоля,*
*З краіны - няволя!*
*Хай добра будзе! -*
*Дай, прашу, людзям*
*Шчодрага году,*
*Добрага ўмалоту,*
*Прыгожых красак,*
*Шчаслівых казак!*

## САМОТНЫ ВЕРАС

*Самотны верас...*
*Верас, што ты хочаш*
*Злавіць у сеці сцебляў*
*легкавейных?*
*Ці слёзы зіхацяць у кветках*
*ноччу,*
*Ці росныя, крыштальныя завеі*
*Пакінулі свой ціхі пацалунак,*
*Пяшчотай атуліўшы кветкі-веі?*

* * *

*Лагодны восеньскі дзянёк*
*Рассыпаў у вышыні аблокі*
*І сарамліва, незнарок*
*Кранае сонцам лісця шчокі.*
*І сумна трохі мне чагось,*
*І радасць светлая навокал.*
*А восень, як жаданы госць*
*Зрабіла небасхіл шырокім.*
*І думкі птушкамі плывуць*
*Удалячынь за лес зялёны,*
*У край, які не дасягнуць,*
*У шлях, нікому не знаёмы.*
*Вяргіня палкая цвіце*
*Пунцовым полымем адчайна,*
*І павуцінне на траве*
*Як быццам з казкі незвычайнай.*

*Дзіяна БУБНОВА*

## ВОСЕНЬ

*Восень... Ціхай хадой падыйшла*
*Услед зялёнаму лету.*
*Ужо, здаецца, было гэта ўсё,*
*І нібыта не гэта...*
*Мне так сёння самотна адной,*
*Душаць нізкія зводы,*
*Ну няўжо ж гэты цяжкі пакой*
*Мне, як крыж, назаўсёды?*
*Хутка след свой пралажыць зіма,*
*Па пажоўклай лістоце.*
*Ну, не век жа я буду адна,*
*У гэтай прыкрай самоце.*
*Усё ж надзея жыве ў душы,*
*Што, устаўшы на золку,*
*Я ўбачу: не дождж церушыць,*
*А іграе вясёлка.*
*А з вясёлкай, як птах, да мяне*
*Прыляціць маё шчасце!..*
*...А пакуль толькі восень у акне...*
*Халадэча... Нянасце...*



# "Наднёманскія галасы": НОВЫЯ ІМЁНЫ

*Ад імені, назвы многае залежыць. Яшчэ і яшчэ раз пераконваешся ў гэтым, рыхтуючы новую падборку вершаў. Не выпадкова і наша суполка мае такую назву, звонкую, бадзёрую і нават крышку музычную. Што ж, розніца паміж музычным голасам і паэтычным не такая ўжо і вялікая. Прынамсі, і той, і другі цяжка падрабіць. Прыемна і мне канстатаваць, што ўсё ж такі ў нашым паэтычным шматгалоссі не згубіліся, не растварыліся, а, наадварот, сталі набываць сваё аблічча маладыя паэты. І справа тут не толькі ў набыцці нейкіх сталых стылёвых адзнак. А ў тым, што кожны бачыць у вакольным свеце сваё і з зайздроснай руплівасцю адкрывае нам новыя, невядомыя грані такога ўжо старога, знаёмага свету, і, больш таго, адчуваецца шчырае жаданне паспавядацца ў сваіх вершах.*

*Таму, як казалі старажытныя рымляне: "Zectori benevolo salutem!" (Прывітанне добразычліваму чытачу!)... і прымайце чарговую споведзь.*

**Святлана ТАРАСАВА,**
**кіраўнік літаб'яднання, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры**

## Дзмітрый МАТУСЕВІЧ

Мы гукаем вясну, каб нам птушкі аб шчасці спявалі,
Каб журчанне дарыў серабыстаю хваляй ручай,
Каб прыгожа цвіла на ўзгорку ў бярозавым гаі
Кветка першая - сімвал любві і жыцця.
Мы гукаем вясну, каб блакітам прастор наліваўся,
Каб пяшчотнае сонца не шкадавала цяпла.
І жаўрук весялей на яго адзываўся,
І каханне дарыла ўсім чараўніца-вясна.

* * *

Хоть твой голос все так же
надрывно хрипит,
Но ведь ты не Высоцкий Володя.
Ты поешь, что и он, этот гений,
убит,
И эпоха запрета не в моде.
И душа твоя неподдельно
скорбит,
О печали глубокой кричит.
Ты поешь, что он, гений, убит...
Я ж прошу, не хрипи, помолчи.
Ты послушай: аккорды не зря
Сквозь январские вьюги
звучат.
И душа, о Великом скорбя,
Ударяет по струнам... Они же
молчат...
Я не видел, не знаю, но в Нем
Есть великая правда одна:
Он хотел показать, что живем
Мы всегда от утра до утра.
Что боимся отчетливых тем
И рисунка кричащих стихов,
Что становимся камешком стен
И помостом гниющих мостов.
Мы не смотрим, в глубины
летя,
Возрождаем забытое зло,
И хрипим только ради себя,
Чтоб похожими быть на Него...

* * *

Нет, в этих словах облака
И снег, разукрашенный в дым.
Любовь одинока, слепа,
Когда ты уже не любим.
И гаснет счастливый узор
Огней, впечатляющих нас.
Любовь - как упрек, как укор,
Когда ее пламень погас.
И только напевы дождя
Становятся милы душе,
Любви в облаках не найдя,
Печаль утоляю в дожде.

## Наталля КУРГАНСКАЯ

### Максіму Багдановічу

Сінія вочы, строгія вусны.
Далікатныя рысы твару
Такім вы былі, пясняр
Беларусі,
Аддаўшы сябе ў ахвяру.
Ад маці прыйшлі дабрыня і
пяшчота,
Любоў да зямлі і да слова.
Аднак і хвароба была ад
Мякотаў,
І ў Вас яна ўскрэсла
нанова.
Вам жа было ўсяго
дваццаць пяць.
Так многа яшчэ не сказалі.
Чайкі над морам ад болю
крычаць.
А недзе "Пагоню" ужо
заспявалі.
Зоркай Венерай хацела б я
быць,
Хацела б начамі заўсёды
свяціць!
На жаль, не жыла я ў ваш
час,
Мілы, цудоўны Максіме,
я б закахалася ў вас!

* * *

Заплакала вясна апошнімі
снягамі,
І чуецца здалёк вясёлы водны
спеў,
А мы ідзём з табой забытымі
шляхамі.
Так хочацца, каб ты далонь
маю сагрэў.
Здаецца, зноў калазварот ў
прыродзе.
Вось так было і будзе так
заўжды;
Хтось і да нас ішоў па гэтай жа
дарозе.
Рука ў руцэ праз вёсны і гады.

## Вольга ШЛАВЕНЕЦ

Я построю дом, снежно-белый
дом,
Будут жить в нем рассвет и
мечта.
И когда-нибудь в нем ярким
солнечным днем
Превратится в любовь
пустота.
Я поставлю в свой дом,
в нежно-ласковый дом,
Окна чистые, словно вода.
И когда-нибудь в нем,
в добром доме моем
Поселиться не сможет беда.
Я наполню свой дом,
звездно-сказочный дом
Теплым светом, как свет
от костра.
И когда-нибудь гром, майский
радостный гром
Пожелает удач и добра.
Не разрушат мой дом,
светло-радужный дом
Ни столетия и ни ветра.
И когда-нибудь гном, добрый,
маленький гном
В нем останется жить
навсегда.

## Максім ЧУГУНОЎ

### Странник

Везде он бродит один,
Без имени, сам себе господин.
Шагает, цепями гремя,
Бичом изнуряя себя.
Идет он по небу, по тучам,
По снегу, по горным кручам
Века напролет вот так он идет
И дивную песню поет:
"Кто же я? Откуда я?
Где мой дом и родная земля?
Бич больно бьет по спине,
И руки не служат мне..."
Он хочет выронить бич свой из
рук,
Но молнии сразу сверкают
вокруг.
И тучи тотчас начинают
темнеть.
И странник опять поднимает
плеть.
И горькие слезы льются из
глаз,
И каждая, словно
камень-алмаз,
И сыплются слезы дождем...
... Кто же он? Кого в нем
узнаем?...

## Надзея МЯРКУЛАВА

### Орион

И в радости, и во гневе
Я светом одним озарен.
Мне светит в огромном небе
Созвездие Орион.
То алый, то зеленый
Его бессмертный свет.
Созвездию Ориона
В космосе равного нет.

* * *

Каля студні летняю ночкай
Укалола бяроза ножку.
Даставаючы стрэмку, к клёну
Нахілілася веццем зялёным.
З той пары не мяняла паставы,
Каля клёна суседкаю стала.
Ліст з лісточкам, галіна з
галінай,
Так застылі ў парыве
адзіным...
І ўсё дастаюць тую стрэмку.

* * *

Проклятье века - это спешка,
И человек, стирая пот,
По жизни мечется, как пешка,
Попав затравленно в цейтнот.
Поспешно лгут,
Поспешно любят,
И опускается душа.
Поспешно бьют.
Поспешно губят.
А после каются, спеша.
Но человек, чье имя свято,
Ты сам себе калечишь жизнь
Среди распада и разврата
Остановись, остановись...



# ПОЗДРАВЛЯЕМ!

**Владимира Игнатьевича СОРОКИНА**

*С ЮБИЛЕЕМ!*

За столько лет все так
привычно,
Устало смотрит объектив.
И все же снимок необычный
Получишь, время посвятив.
Вся жизнь университетская
Как на ладони пред тобой:
Визиты и приемы светские,
И дело, ставшее судьбой.
Желаем поиска и радости,
Здоровья, счастья и добра,
Желаем бодрым быть,
до старости
Пусть длится творчества пора!

**Редакция газеты "Гродзенскі універсітэт".**



Усё ўпершыню: і вясельны ўбор, і вянчальныя свечкі... Няхай доўгім і моцным будзе каханне, няхай шчаслівай будзе новая сям'я! Сімвалічна, што Алена і Пётр Таранцей сталі мужам і жонкай у дзень Святога Валянціна, дзень закаханых. Пётр вучыцца на 5 курсе факультэта правазнаўства, Алена - таксама пяцікурсніца, з філалагічнага.

Шчасця, здароўя, радасці новай сям'і зычаць сябры і знаёмыя.

## Для вас, паліглоты

Аб'яўляецца набор слухачоў на курсы вывучэння замежных моў:

англійская мова - для пачынаючых;

англійская мова - для тых, хто хоча атрымаць спецыяльнасць;

французская мова - для пачынаючых;

французская мова - для тых, хто хоча атрымаць спецыяльнасць;

французская мова - курс перакладу з французскай на рускую мову;

нямецкая мова - для пачынаючых.

За даведкамі звяртайцеся ў галоўны корпус універсітэта, 3 паверх, аўдыторыя 334, з 10 да 15 гадзін, акрамя суботы і нядзелі.

# ПРИГЛАШАЕТ "СОЛЯРИС"

В г. Гродно группой молодых людей создано молодежное общественное объединение альтернативного искусства "СОЛЯРИС" (зарегистрировано в управлении юстиции Гродненского облисполкома 11 ноября 1996 года, свидетельство N 0107). Главной целью деятельности объединения "СОЛЯРИС" является объединение и направление усилий своих членов для содействия в развитии альтернативного искусства, разработка своих программ развития и популяризации альтернативного искусства, выявление творческих потенциалов в молодежной среде и привлечение молодых людей к практической работе в этих направлениях деятельности.

Объединением проведена и проводится значительная работа в области развития в городе культурного молодежного движения. Так, идет сбор информации о деятельности в городе молодых творческих людей в различных направлениях искусства. Ведется работа по образованию на базе кинотеатра "Космос" киноконцертного зала для проведения концертов. В декабре 1996 года состоялось открытие его концертом групп "КРАМА" (г. Минск), BLUES BEER DRINKERS" (Польша) и "SLEEPING BEES" (г. Гродно).

В настоящее время идет подготовка к проведению ряда концертов гродненских групп различных музыкальных стилей. Первый концерт состоялся 31 января 97 г., в нём приняли участие несколько рокгрупп г. Гродно. Одновременно разрабатывается проект вернисажа с участием молодых художников г. Гродно.

Молодежное объединение "СОЛЯРИС" приглашает Вас к сотрудничеству в области развития молодежного искусства, а также объявляет о приеме заявок на участие в ROCK-SESSION'97 под кодовым названием "Скоро лето". Ваши ДЕМО-ТАРЕ и просто заявки и предложения ждем по телефонам: 2-09-42, 44-00-64.

**К. ХОЛОДНЫЙ,**
**Президент МООАИ "СОЛЯРИС"**

## Продам

Подрощенного щенка бультерьера. Надежный друг, престижный сторож с отличной родословной, умен и красив.

**Телефон: 31-79-57.**

# ☺ З УСМЕШКАЙ... ☺

Едуць два каўбоі. Адзін курыць вельмі дарагую цыгару. Другі ўпотай зайздросціць.

- Паслухай, Джон, - нарэшце кідае ён, каб хоць нечым зачапіць прыяцеля. - З гэтай дарагой цыгарай у зубах ты змахваеш на дурня.

- Прабач, Біл, - спакойна адказвае Джон, - цяпер буду змахваць у другі бок.

☹ ☺ ☺

Васіль Іванавіч сядзіць у хаце ў чым маці нарадзіла з тоўстай цыгарай у зубах. Уваходзіць Пецька.

- Васіль Іванавіч, ты чаму голы?

- А што рабіць, Пецька? Бачыш, на сцяне напісана: "Ноу смокінг!"

☹ ☺ ☺

- Абвінавачваемы, што вы рабілі да жаніцьбы?

- Усё, што хацеў, грамадзянін суддзя!

☹ ☺ ☺

- Як табе спадабаўся выкладчык, што прымаў экзамен?

- Вельмі набожны чалавек.

- Чаму ты так вырашыў?

- Калі я адказваў, ён увесь час, закаціўшы вочы, шаптаў: божа мой, божа...

☹ ☺ ☺

Два ветэрынары скончылі аперыраваць слана.

- Пагдядзі, мы не зашылі ніякіх інструментаў?

- Дарэчы, а дзе наша медсястра?

☹ ☺ ☺

Навошта ты пафарбаваў валасы ў сівы колер?

- Я прачытаў у адной кнізе, што тыя мужчыны, якія рана сівеюць, ніколі не лысеюць!

☹ ☺ ☺

- Вашы адносіны да ўлады?

- Як да сваёй жонкі.

- ?!

- Трошкі баюся, трошкі хвалю, трошкі люблю, але хачу іншую.

☹ ☺ ☺

- Тры гады таму мы з мужам паспрабавалі адпачываць асобна.

- Ну, і як?

- Не ведаю, ён яшчэ не вярнуўся.

**(Па матэрыялах друку краін СНД).**

Газета **"Гродзенскі універсітэт"** размяшчае на сваіх старонках

*БЯСПЛАТНУЮ РЭКЛАМУ.*

Калі Вы хочаце што-небудзь прадаць, купіць, памяняць, прапанаваць паслугі, пазнаёміцца, павіншаваць з днём нараджэння і г.д., звяртайцеся ў рэдакцыю газеты "Гродзенскі універсітэт".

Памятайце, што газета выходзіць у першай пяцідзёнцы штомесяц.

***Наш адрас:***
**галоўны корпус, другі паверх, п. 228; тэлефон: 72-08-17.**

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

*Рэдактар* **Л.ДАНІЛАВА.**
*Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, П. КРЫШАЛОВІЧ**

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 18.02.97*
*Заказ № 27*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228. ☎ 72-08-17.